Беларусь.info

№68 07/06/2006

*Найдакладнейшае вымярэнне каштоўнасці чалавека — не тое, што ён робіць у час спакою і ўтульнасці, а тое, як ён трымаецца падчас барацьбы і супярэчнасцяў.*
**Марцін Лютэр Кінг**

Грамадская пазапалітычная і пазацэнзурная ініцыятыва. Распаўсюджваецца бясплатна

# Падзеі

**Галадоўку па-ранейшаму трымаюць 25 чалавек.** Актывісты моладзевых рухаў працягваюць галадоўку пратэсту. Частка галадоўнікаў спыніла акцыю — у асноўным гэта непаўналетнія сябры незарэгістраванай арганізацыі “Малады фронт”. Але да акцыі далучыліся некалькі новых удзельнікаў у рэгіёнах. Моладзь патрабуе спыніць крымінальныя справы супраць актывістаў “Маладога фронту”, вызваліць палітвязьняў, аднавіць на вучобе апазыцыянэраў, а таксама спыніць перасьлед вернікаў-хрысьціянаў.

**Украінцы будуць дапамагаць беларускім палітвязьням.** Ва Ўкраіне пачала дзейнічаць філія Камітэту дапамогі палітрэпрэсаваным у часе прэзыдэнцкай выбарчай кампаніі ў Беларусі. Украінскія партнэры дапамагаюць уладкоўвацца на вучобу беларускім студэнтам, якіх адлічылі за апазыцыйную дзейнасьць. Апроч таго, былыя вязьні турмаў на Акрэсьціна, Жодзіна, Менску змогуць адпачыць ва ўкраінскіх Карпатах.

**А.Лябедзька выступае за супрацоўніцтва з партыяй А.Казуліна.** 6 чэрвеня Палітычная рада аб’яднаных дэмакратычных сіл абмеркавала пытаньне пра неабходнасьць перамоваў зь Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыяй (Грамада) для выпрацоўкі агульнай стратэгіі й пляну дзеяньняў апазыцыі. Ініцыяваў пытаньне пра кааліцыю з партыяй Аляксандра Казуліна Нацыянальны камітэт аб’яднаных дэмакратычных сіл. 5 чэрвеня на паседжаньні камітэту яго старшыні Анатолю Лябедзьку было даручана агучыць гэтую ініцыятыву і разгледзець яе на паседжаньні Палітычнай рады.

**Беларускі СУ-25 змусіў прызямліцца ў Лідзе літоўскі самалёт**. Радыё Свабода Беларускія вайскоўцы прымусілі прызямліцца літоўскі самалёт, які без дазволу перасёк літоўска-беларускую мяжу. Інцыдэнт зь літоўскім самалётам адбыўся 6 чэрвеня ў 19 гадзінаў. Дзяжурныя СПА зафіксавалі ў небе над краінай лёгкаматорны самалёт-парушальнік, які перасек беларуска-літоўскую мяжу недалёка ад Ліды. Там жа на вайсковым аэрадроме й прымусілі сесьці літоўскага лётчыка.

**Калі рашэнне аб будаўніцтве атамнай электрастанцыі ў Беларусі будзе прынятае, эколагі маюць намер перашкодзіць яго ажыццяўленню.** Такую заяву зрабіў кіраўнік чарнобыльскага праекту Greenpeace International Іван Блокаў. Нагадаем, рашэнне аб будаўніцтве яшчэ не прынятае, але шмат хто з чыноўнікаў і экспертаў лічаць гэта справай часу.

# Цытаты

**Аляксандр Мілінкевіч патрабуе неадкладнага вызвалення Аўтуховіча: - Аўтуховіч не скорыцца! Ён аддае за праўду сваё жыццё.** Справа надзвычай сур’ёзная. І рэжым павінен з гэтым лічыцца і ведаць, што цалкам нясе адказнасць за жыццё гэтага мужнага чалавека. Кожны неабыякавы чалавек павінен сёння патрабаваць ад уладаў тэрміновага вызвалення невінаватага чалавека. Змаганне Мікалая супраць адпрацаванай дзяржаўнай машыны ціску на асобу з актыўнай жыццёвай пазіцыяй ёсць змаганнем за праўду ў гэтай краіне. Я выказваю Мікалаю сваю падтрымку, асабіста для мяне ён з’яўляецца прыкладам мужнасці і “.

# Абвесткі

**Новы конкурс – "Фота Свабоды"**. "Фота Свабоды" – Ваш погляд на беларускае жыццё. Дасылайце (з кароткім апісаннем – што, дзе, калі) здымкі падзеяў, сітуацыяў, людзей на адрас svaboda@rferl.org з пазнакай "fota Svabody". Падрабязнасці на www.svaboda.org